Уладзімер Хадыка

# Пуціна срэбная, сінь бору мудрая...

Пуціна срэбная, сінь бору мудрая;
Краіна дзіўная, золатакудрая.

———

У крушнях гінула, журбой спавітая—
Жыцьцё нявольніцы кляла сярдзітае.

———

А парась ціхую віхалі звонамі—
І буры водгалас і сны чырвоныя...

———

Званіла вёснамі паўстанцкім бродам гаць:
—Гэй, восень хмурая, даволі збродаваць!

———

І ветры гойсалі, і ночы кракалі,
І неба рвалася, і хвоі плакалі...

———

І кроплі булькалі мотывы новыя
І раньне песьцілі гаі кляновыя.

———

Прасторы зыбаліся нязнаным шоламам
А золь мяцежная пісала полымем,—

———

Каб зграя чорная не гайдамачыла...
Старонка любая, ты аджабрачыла!

———

І песьні моцныя і думы мудрыя,
Краіна дзіўная, золатакудрая—

———

Настольнік выткала Сярпу і Молату...
Тут жыцьцё вольнае, тут людзі волаты.

———

# Па вясновым торам

Па вясновым торам
Травянеюць гоні.
Новым пераборам
Вецер у шыбу звоніць.

———

Шалам векавіты
Ходзіць па дарозе.
Чмарыя ракіты
Моляцца бярозе.

———

Зелені гутаньне,
Карагоды кветак
Як вясны каханьне,
Сэрца вабяць гэтак.

———

Сьветлыя спадзеі
Сласна туляць грудзі,
Межы—ліхадзеі
Больш не напракудзяць.

———

Думкі рагазою
Не зьбягуць к бур'яну
Сябраваць з лазою
Ў верасень ня стану.

———

Буду там, дзе звоніць
Золак раніцовы,
Дзе сьпяваюць гоні
Пераборам новым.

———

А калі з віціны
Ў вечнае схіснуся –
Сэрцам не загіну
Ў песьнях Беларусі.

Быкоўскі

# Дні

Імкліваць дні напорнаю пагоняй,
заф рбаваныя ў чароўныя страі
і кожны дзень нясе сваёй зары прадоньне
таму і радасьцю нязнанаю гарыць.

А мо‘туга нясе нам новы дзень;
бо радасьць і туга аднэй ступаюць сьцежкай—
лебедзьве кволыя, як хвалі на вадзе,
як ноч вясновая з хмялёваю ўсьмешкай.
Імкліваць дні—спалоханыя коні,
мільгаюць бяз сьледа і радасьці і сум,
і сеюць раніцай на сінія загоны
туманна-белую празрыстую расу.